# § 47. Скланенне якасных і адносных прыметнікаў у множным ліку

**295.** Прачытайце. Якую думку перадае аўтар у вершаваных радках?

Родны край — край азёраў гл..бокіх
І чаромхавых белых завей,
Край б..розак і сосен высокіх,
Працавітых і шчырых людзей[м].
*Я. Жабко.*

Спішыце, устаўляючы прапушчаныя літары. Пастаўце пытанні ад назоўнікаў да прыметнікаў, якія іх паясняюць. Вызначце, у якой форме ўжыты прыметнікі. Растлумачце, чаму яны маюць розныя канчаткі.

**296.** Прачытайце табліцу. Ад чаго залежаць канчаткі прыметнікаў?

| **Скланенне прыметнікаў у множным ліку** | | | |
|---|---|---|---|
| **Склон** | **Прыметнікі з асновай** | | |
| | **на цвёрды і зацвярдзелы зычныя** | **на *г, к, х*** | **на мяккі зычныя** |
| Н. | *зімов**ыя** вечары*<br>*бур**ыя** мядзведзі* | *гарадск**ія** вуліцы*<br>*дараг**ія** сябры* | *ранішн**ія** газеты*<br>*сін**ія** вочы* |
| Р. | *зімов**ых** вечароў*<br>*бур**ых** мядзведзяў* | *гарадск**іх** вуліц*<br>*дараг**іх** сяброў* | *ранішн**іх** газет*<br>*сін**іх** вачэй* |
| Д. | *зімов**ым** вечарам*<br>*бур**ым** мядзведзям* | *гарадск**ім** вуліцам*<br>*дараг**ім** сябрам* | *ранішн**ім** газетам*<br>*сін**ім** вачам* |
| В. | *зімов**ыя** вечары*<br>*бур**ых** мядзведзяў* | *гарадск**ія** вуліцы*<br>*дараг**іх** сяброў* | *ранішн**ія** газеты*<br>*сін**ія** вочы* |
| Т. | *зімов**ымі** вечарамі*<br>*бур**ымі** мядзведзямі* | *гарадск**імі** вуліцамі*<br>*дараг**імі** сябрамі* | *ранішн**імі** газетамі*<br>*сін**імі** вачамі* |
| М. | *(па) зімов**ых** вечарах*<br>*(пры) бур**ых** мядзведзях* | *(на) гарадск**іх** вуліцах*<br>*(пры) дараг**іх** сябрах* | *(у) ранішн**іх** газетах*<br>*(у) сін**іх** вачах* |

Складзіце два сказы са словазлучэннямі *зімовыя вечары* і *бурыя мядзведзі*, ужываючы назоўнікі і прыметнікі ў форме вінавальнага склону.

**297.** Прачытайце і адгадайце загадку.

Пад зімн.. залевай*
Стаіць каралевай —
У ярк.., агніст..
Прыгож.. маністах*.
Маніст не шкадуе —
Птушак[м] частуе.

*М. Пазнякоў.*



Якое слова мае значэнне ‘ўпрыгожанне з манет, па́церак, каштоўных камянёў, што надзяваецца на шыю’?

Выпішыце словазлучэнні «прыметнік + назоўнік». Пастаўце пытанні ад галоўнага слова да залежнага. Вызначце лік і склон прыметнікаў.

Праскланяйце спалучэнне слоў *яркія, агністыя прыгожыя маністы.*

!

У **назоўным склоне** множнага ліку прыметнікі маюць канчаткі **-ыя** (аснова на цвёрды і зацвярдзелы): *зімов***ыя**, *бур***ыя**; **-ія** (аснова на **г, к, х** і мяккі): *дараг***ія**, *сін***ія**.

У **вінавальным склоне** канчаткі прыметнікаў залежаць ад таго, да якога назоўніка дапасуецца прыметнік:

- В. скл. = Н. скл. (неадушаўлёны назоўнік): Н. скл. *зімов***ыя** *вечары, сін***ія** *вочы* — В. скл. *зімов***ыя** *вечары, сін***ія** *вочы*;
- В. скл. = Р. скл. (адушаўлёны назоўнік): Р. скл. *бур***ых** *мядзведзяў, дараг***іх** *сяброў* — В. скл. *бур***ых** *мядзведзяў, дараг***іх** *сяброў*.

У **родным** і **месным склонах** ужываюцца канчаткі **-ых** (аснова на цвёрды і зацвярдзелы): *зімов***ых**, *бур***ых**; **-іх** (аснова на **г, к, х** і мяккі): *сін***іх**, *дараг***іх**.

У **творным склоне** прыметнікі маюць канчаткі **-ымі** (аснова на цвёрды і зацвярдзелы): *зімов***ымі**, *бур***ымі**; **-імі** (аснова на **г, к, х** і мяккі): *сін***імі**, *дараг***імі**.

*з-пад*

**298.** Прачытайце. Спішыце сказы, раскрываючы дужкі і ўстаўляючы прапушчаныя літары.

1. Я нарадзі..ся ў Беларусі[м] між *(белы)*, *(казачны)* бяроз *(К. Жук)*. 2. У *(салігорскі)* шахтах мы сільвініт* зна..шлі. І *(рэчыцкі)* нафта фантаніць[сл] з-пад з..млі *(М. Хведаровіч)*. 3. Пра будучыню марыў я не раз. Аб людзях *(працавіты)*, *(горды)*, *(чысты)* *(П. Панчанка)*. 4. Я ў *(светлы)* б..рэзнікі ўлюбёны, люблю блукаць і ў *(восенькі)* б..рах *(Х. Гурыновіч)*.

Вызначце лік і склон прыметнікаў. Складзіце схему першага сказа.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**299.** Прачытайце тэкст. Да якога стылю і жанру ён адносіцца?

## Шчаслівая кніга

Вераніка прыехала да сваёй стрыечнай сястры Карыны. Дзяўчынкі размясціліся ў дзіцячым пакоі. На паліцах сядзелі прыгожыя лялькі, у крэсле месціліся пухнатыя медзведзяняты[м], на шырокім падаконніку ў празрыстым акварыуме жылі русалкі з доўгімі валасамі, у куце стаяў вялікі лялечны домік.



Вераніка дастала з заплечніка зашмальцаваную* кнігу.

— І ў мяне такая ёсць! — сказала Карына і дастала з паліцы новенькую кніжку.

— Няшчасная мая сястрыца! — усхліпнула новенькая кніга.

— Наадварот. Я вельмі шчаслівая! — адгукнулася зашмальцаваная. — Я любім.. кніга маёй гаспадыні. Яна зачытваецца маімі цікав.. гісторыямі, бярэ мяне ў падарожжы па знакаміт.. мясцінах Беларусі і ў далёк.. замежжа. Мяне не ўбачыш на кніжн.. паліцах сярод новеньк.. кніжак.

— Кожная кніга хоча быць шчаслівай[ф]! — прашаптала новенькая кніга. — Няхай чытачы памятаюць пра гэта! *(Паводле К. Хадасевіч-Лісавой).*

Як вы разумееце выраз «Кожная кніга хоча быць шчаслівай»?

З аповеду зашмальцаванай кнігі выпішыце словазлучэнні «прыметнік + назоўнік». Растлумачце напісанне канчаткаў.

Падзяліце тэкст на часткі. У якой частцы пададзена апісанне пакоя? Ці адпавядае яно таму, што перададзена на малюнку?

Складзіце план тэксту. Вусна перакажыце тэкст па плане.

**300.** Устанавіце адпаведнасць паміж фразеалагізмамі і іх значэннямі.

1) па гарач.. слядах
2) чуж.. рукамі жар заграбаць
3) на задн.. лапках хадзіць

а) ‘карыстацца вынікамі працы іншых’
б) ‘прыслугоўваць, дагаджаць’
в) ‘неадкладна, не марудзячы’

Вызначце, у якіх формах ужыты прыметнікі ў фразеалагізмах.
Складзіце з фразеалагізмамі сказы. Запішыце іх.